# ВОДЗЫЎ
аб аўтарэфераце дысертацыі
Старасценка Таццяны Яўгенаўны
"ДЫНАМІКА БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ
XX СТАГОДДЗЯ: ЛЕКСІКА-ГРАМАТЫЧНЫЯ СРОДКІ,
КАМУНІКАТЫЎНЫЯ МАДЭЛІ І ІХ УЗАЕМАДЗЕЯННЕ",
прадстаўленай на саісканне вучонай ступені
доктара філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Дысертацыйнае даследаванне Т.Я.Старасценка прысвечана аднаму з найбольш важных напрамкаў, звязанага з вывучэннем стылістыкі мовы мастацкага тэксту як актыўнага ўзаемадзеяння разнастайных суб'ектаў камунікацыі.

Як сведчыць аўтарэферат дысертацыі, у ёй вырашаецца мэта выяўлення моўных сродкаў эксплікацыі дынамікі беларускага мастацкага тэксту XX ст., устанаўлення асаблівасцей узаемадзеяння камунікантаў паэтычнага і празаічнага дыскурсу, раскрыцця падабенства і адрознення ідыястыляў айчынных пісьменнікаў розных часавых перыядаў.

Атрыманыя вынікі характарызуюцца навуковай навізной. У прыватнасці, гэта датычыцца выяўленага падабенства і адрознення ідыястыляў пісьменнікаў і створанай цэласнай стылістычнай карціны беларускага мастацкага дыскурсу XX ст. як сістэмы дынамічнага разгортвання знешняга і ўнутранага дыялогу на ўзроўні розных часавых перыядаў паэтычнага і празаічнага дыскурсу; устаноўленых асацыятыўных радоў ключавых зваротканў, сістэмы бінарных канцэптаў і іх варыянтаў у беларускім паэтычным дыскурсе; вызначаных сродкаў эксплікацыі камунікатыўных мадэлей аўктарыяльнага і дыегетычнага наратыву.

Сукупнасць атрыманых вынікаў дазваляе канстатаваць, што ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве праведзена даследаванне ў галіне новага напрамку камунікатыўнай стылістыкі мастацкага тэксту – дыялагічнай стылістыкі.

У выніку азнаямлення з аўтарэфератам (дарэчы, з вялікай для нас цікавасцю) мы можам адзначыць, што дысертацыйнае даследаванне Т.Я. Старасценка адпавядае тэматыцы буйных навуковых праграм і праектаў, у тым ліку ДПНД «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гады (падпраграма «Беларуская мова і літаратура»); ДПНД «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021–2025 гады. Яно прайшло належную апрабацыю на прадстаўнічых навуковых канферэнцыях у Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі; вытрымліваюцца і патрабаванні ВАК Беларусі да апублікаванасці вынікаў дысертацыйнага даследавання на саісканне навуковай ступені доктара навук.

Разам з тым з аўтарэферата застаецца не зусім зразумела, якім чынам суадносяцца паняцці "дынаміка мастацкага тэксту" (гл. загаловак) і "дынаміка камунікатыўнай прасторы" (сс. 27, 29). Не лішнімі былі б і дэфініцыі гэтых

паняццяў у тэксце аўтараферата. Гэта ж датычыцца і паняццяў "тэкставы асацыят" і "тэкставы асацыятыўны рад" (сс. 2, 5 і інш.).

На с. 5 сустракаем не зусім зразумелае, на нашу думку, сцвярджэнне "…чытач мадэлюе ідыястыль пісьменніка…". Ці ўзнікае ў звычайнага чытача жаданне нешта "мадэляваць" падчас прачытання мастацкага твору?

Нарэшце, хацелася б даведацца і аб тым, якім чынам "дамінуючыя бінарныя канцэпты" (с. 5 і інш.) былі вылучаны менавіта як *"дамінуючыя"*.

Падкрэслім, што адзначаныя крытычныя моманты маюць выключна прыватны характар, і адказы на гэтыя пытанні найхутчэй ёсць у тэксце дысертацыі. Вынікі даследавання, якое ажыццявіла Т.Я. Старасценка, грунтоўныя, самадастатковыя, запатрабаваныя часам. Яны змогуць знайсці выкарыстанне пры далейшай распрацоўцы праблем філалагічнага аналіза тэксту, камунікатыўнай стылістыкі, літаратуразнаўства, тэксталогіі.

Лічу, што ў адпаведнасці з патрабаваннямі Палажэння аб прысуджэнні навуковых ступеняў і прысваенні навуковых званняў Старасценка Таццяне Яўгенаўне можа быць прысуджана навуковая ступень доктара філалагічных навук па спецыяльнасці "10.02.01 – беларуская мова".

Прафесар кафедры беларускай
і рускай філалогіі
УА МДПУ імя І.П.Шамякіна,
доктар філалагічных навук,
дацэнт С.Б. Кураш
09.02.2024

С.Б. Кураш
...чную подпись...
...веряю
Инспектор ОК ... Ткач
"___" __________ 20__ г.
АДДЗЕЛ КАДРАЎ